*І.С. КАШТАЛЯН*

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ШТОДЗЁННАЙ ГІСТОРЫІ БССР У КАНТЭКСЦЕ ЎПЛЫВУ РЭПРЭСІЎНЫХ ФАКТАРАЎ УНУТРАНАЙ ПАЛІТЫКІ СССР (1944-1953)

Анализируется современная историографическая ситуация по проблеме изучения влияния репрессивных факторов на повседневную жизнь белорусского общества в первое послевоенное десятилетие. Делается вывод об отсутствии общего исследования по данному направлению.

The article analyses present historiographic situation in regard to the problem of the Impact of Repressive Factors on everyday life of the Belarusian society in first postwar decade. It concludes that there is no general investigation in this direction.

Даследаванне штодзённай гісторыі актуальна вызначэннем яе тыповых праяў. Звернутасць да чалавека дазваляе азнаёміць з новым аспектам разгляду гісторыі пасляваеннай Беларусі праз аналіз асаблівасцей штодзённага жыцця простых людзей у гарадах і сельскай мясцовасці пад уплывам рэпрэсіўных фактараў палітыкі ўлад.

Для вызначэння характэрных рыс у жыцці насельніцтва БССР у 1944-1953 гг. неабходна спалучэнне макра- і мікрападыходаў. Манаграфіі даследчыкаў, выдадзеныя ў савецкі час, традыцыйна нясуць ідэалагічны адбітак. Рэпрэсіі, якія ўспрымаліся як апраўдваемыя мэтамі дзяржавы, асобна, як і штодзённасць, не вывучаліся. Пераасэнсаванне гісторыі СССР у пачатку 1990-х прывяло да актыўнага перагляду стаўлення і да пасляваеннага часу. Важна адзначыць працы, прысвечаныя макрагістарычным падзеям, істотныя для асэнсавання феномена беларускай штодзённасці ў межах Савецкага Саюза аналізуемага перыяду. Напрыклад, грунтоўнае даследаванне юрыдычнага боку існавання таталітарнага рэжыму ў СССР у 1917-1953 гг. правёў А.Ф. Вішнеўскі .

З пункту гледжання гістарычнай сацыялогіі савецкая штодзённасць цікавая па самой сітуацыі выбару ці магчымага яго абмежавання. Сацыялагічны падыход да праблемы сталінізму прапанаваны ў працах М.В. Раманоўскага, У. Ільіна[2].

Значны інтарэс уяўляе манаграфія сацыяльнага гісторыка Е.Ю. Зубковай[3] пра пасляваеннае штодзённае жыццё насельніцтва СССР, арыентаваная на вывучэнне грамадскага меркавання дадзенага перыяду.

Асобныя працы па штодзённасці горада адсутнічаюць, блізкімі да тэмы застаюцца манаграфіі па некаторых пытаннях, адпаведных менавіта гэтаму асяроддзю, сярод якіх адзначым даследаванні пра суды гонару ў ідэалогіі і практыцы пасляваеннага сталінізму В.Д. Есакова, Е.С. Левінай і інш.[4]

Праблемы савецкай вёскі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе яшчэ ў савецкі час даследавалі В.С. Долгаў, В.Б. Чысцякоў[5], у 1990-х іх вывучалі М.А. Безнін, Т.М. Дзімані, В.Ф. Зіма, В.П. Папоў, якія разглядалі сувязь эканамічнай палітыкі і выкарыстання прымусовых метадаў у штодзённым жыцці савецкай вёскі[6]. Некаторыя даследчыкі, напрыклад В.М. Вярбіцкая, ацэньвалі гісторыю сялянства першых пасляваенных год праз праблему рассяляньвання вёскі[7].

Шэраг манаграфій прысвечаны царкоўна-дзяржаўным стасункам у пераходны для праваслаўнай царквы перыяд ад вайны да міру і новаму курсу дзяржаўнай палітыкі па рэлігійным пытанні, напрыклад, манаграфіі О.Ю. Васільевай, М.В. Шкароўскага[8].

Меншая распрацаванасць пасляваеннага перыяду гісторыі СССР у параўнанні з іншымі звяртае ўвагу да спецыялізаваных прац па асобных тэмах, якія да гэтага былі так званымі белымі плямамі. Неразрыўна звязана з пытаннем рэпрэсіўных фактараў рэакцыя насельніцтва, напрыклад супраціўленне. Розныя бакі гэтай з'явы ілюструюць працы Ю.Ф. Лукіна і Д. Байраў[9].

Пытанні вяртання остарбайтэраў на радзіму, рэпатрыяцыя савецкіх грамадзян былі значнымі ў пасляваеннай штодзённасці. Грунтоўнае даследаванне лёсаў названай катэгорыі грамадзян у СССР правёў Ю.Н. Арзамаскін[10].

Афіцыйная палітычная культура савецкага пасляваеннага грамадства ўзгадвалася ў той ці іншай ступені большасцю даследчыкаў гэтага перыяду, але разгляд працэсаў яе ўвядзення ў органах МУС упершыню зрабіў А.М. Беда[11]. Эвалюцыя вобраза ворага ў савецкай прапагандзе ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ў працы А.В. Фацеева[12].

Аднак для згаданых вышэй даследаванняў, акрамя А.Ф. Вішнеўскага, не ўласцівы аналіз спецыфікі БССР як рэгіёна ў адзначаным прамежку часу. Таму мы ў першую чаргу абапіраемся на вывучэнне гістарыяграфіі менавіта беларускіх тэрыторый. Грунтоўна разглядаецца гісторыя БССР першага пасляваеннага дзесяцігоддзя ў манаграфіі М. Касцюка[13], дзе раскрыта сутнасць савецкай формы кіравання, этапы яе ўсталявання ў Беларусі, станоўчыя і адмоўныя бакі.

Абагульняючых прац па штодзённасці беларускага грамадства ў 1944-1953 гг. няма ні ў айчыннай, ні ў сусветнай гістарыяграфіі. Розныя аспекты аднаўлення народнай гаспадаркі пасля вайны, звязаныя са штодзённасцю, закраналіся ў працах Г.П. Бушчык, І.Я. Марчанкі[14].

Гісторыя пасляваеннага гарадскога асяроддзя БССР адлюстравана ў працах пра рабочы клас (характэрна для савецкага перыяду)[15], а таксама пра інтэлігенцыю (даследчыкі В. Астрога, Т.Р. Карзенка[16]). Праблемы ўзаемадачынення паміж уладай і гісторыкамі, выкарыстання гісторыі як ідэалагічнай навукі разглядаюцца ў манаграфіі нямецкага вучонага Р. Ліндэра[17].

Аграрныя пераўтварэнні ў пасляваеннай беларускай вёсцы даследаваліся А.П. Белязо, А.І. Котавым[18]. Прымусовасць пры правядзенні калектывізацыі заходнебеларускай вёскі названага перыяду была характэрнай рысай, што адлюстравана ў працах У.І. Навіцкага, А.М. Сарокіна[19].

Дзейнасць розных рэлігійных канфесій у БССР, сутыкненне вернікаў з рэпрэсіўнай палітыкай - важная частка пасляваеннай штодзённасці. Зменам у рэлігійным жыцці пасляваеннай Беларусі, супярэчнасцям суіснавання рэлігійных канфесій з уладай прысвечаны працы А.У. Верашчагінай, А.В. Гурко, У.І. Навіцкага[20].

Самым даследуемым аспектам гістарыяграфіі штодзённай гісторыі БССР з'яўляецца антысавецкае супраціўленне, карані якога часта шукаюць у калабарацыянізме Другой сусветнай вайны. Напрыклад, падрабязна вывучае дзейнасць Арміі Краёвай Я.І. Сямашка[21], але пасляваенны час у яго матэрыялах прадстаўлены нязначна. Праз дакументальную хроніку з каментарыямі асвят-

ляюць гісторыю польскага нацыяналістычнага падполля на Беларусі В.І. Ермаловіч і С.Е. Жумар[22], але ў сувязі з выкарыстаннем вялікай колькасці крыніц характарызуемы перыяд разглядаецца ў агульных рысах.

У публікацыях І.А. Валахановіча, А. Гардзіенкі аналізуецца дзейнасць антысавецкіх падпольных арганізацый і ўзброеных фарміраванняў, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі ў адзначаны перыяд[23]. С. Ёрш і М.М. Чарняўскі даследавалі асобныя антысавецкія арганізацыі[24].

Пэўную цікавасць уяўляе даведнік "Антысавецкія рухі ў Беларусі: 1944-1956"[25], які прэтэндуе на энцыклапедычнасць, падаючы ў частках сістэматызаваную інфармацыю пра персаналіі, арганізацыі, асяродкі антысавецкіх рухаў у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Асноўныя крыніцы выдання - вусныя ўспаміны ўдзельнікаў. Гэта першая спроба комплекснага разгляду дадзенага пытання. Аўтары ўздымаюць праблему размежавання сюжэтаў Другой сусветнай вайны і пасляваеннага антысавецкага руху.

Неспрыяльны збег гістарычных акалічнасцей прыводзіў да вялікай эміграцыі з Беларусі ў пасляваенны час. Розныя пытанні абмену насельніцтвам паміж БССР і Польшчай у 1944-1946 гг. вывучаліся А.Ф. Вялікім, Г.В. Елізаравай, А. Сідлярэвіч[26]. З акцэнтам на гісторыю беларускай дыяспары ў ЗША В. Кіпель[27] аналізуе хвалі і прычыны эміграцыі з Беларусі, робіць агляд даследаванняў, публікацый і статыстычных крыніц. Е.А. Грэбень, Г.Д. Кнацько, В.Д. Селеменеў і іншыя ўздымаюць яшчэ адну важную для пасляваеннага часу тэму - рэпатрыяцыю савецкіх грамадзян[28].

Шматаспектнасць даследавання штодзённасці патрабуе разгляду вялікай колькасці пытанняў жыцця ў БССР, як, напрыклад, праблемы размяшчэння ваеннапалонных і інтэрніраваных, іх стасункаў з насельніцтвам. Псторыка-прававому аспекту гэтай тэмы прысвечана даследаванне А.В. Шаркова[29].

Некаторыя гісторыкі (напрыклад, Е.М. Цішчанка, Н.П. Галімава[30]) адкрылі спецыфічныя пытанні - па аднаўленні школьнай адукацыі, ахове здароўя ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.

Адну з малавядомых старонак гісторыі Беларусі разглядаемага перыяду прадстаўляе мікрагістарычнае даследаванне асаблівасцей палітычнага жыцця Ляхавіччыны ў 1944-1950 гг. Дз.В. Лісейчыкава[31], дзе шмат увагі надаецца менавіта штодзённаму жыццю гэтага рэгіёна, супраціўленню звычайных людзей вяртанню савецкай улады.

Значна ўплывалі на пасляваенную штодзённасць рэпрэсіўныя фактары ўнутранай палітыкі СССР. Іх вывучэнне выяўляе шмат аспектаў, якім прысвечаны аналіз постсавецкіх даследаванняў па гісторыі палітычных рэпрэсій у Расіі і СССР А.С. Кана[32].

У.М. Кудраўцаў і А.І. Трусаў уздымаюць пытанні ажыццяўлення карнай палітыкі, станаўлення апарату "палітычнай юстыцыі", метадаў яго работы[33]. Комплекснае даследаванне біяграфій расійскіх і савецкіх пракурораў XX ст. А.Г. Звягінцава і Ю.Г. Арлова дапаўняецца фундаментальнай працай П. Саламона пра ролю права ў савецкім грамадстве[34]. Статыстычныя матэрыялы па зняволеных, рэпатрыяцыі, кулацкай ссылцы разглядаюцца ў артыкулах В.Н. Земскова[35]. Актыўны інтарэс даследчыкаў да вывучэння карнай палітыкі СССР, як раней забароненай, але актуальнай тэмы, спрыяў выданню некаторых матэрыялаў з дапамогай расійскіх улад: напрыклад, даведніка па зменах у карных органах СССР[36]. Гэтай праблеме прысвяцілі працы М.Г. Дзяткоў, А.І. Кокурын, М.В. Пятроў, якія разглядалі развіццё карных структур, гісторыю выканання крымінальнага заканадаўства СССР[37]. Цэнзура актыўна выкарыстоўвалася для ідэалагічнага кіравання ў савецкай дзяржаве. Так было і ў 1940-я, калі сістэма палітычнага кантролю склалася ў канчатковым выглядзе. Даследаванню цэнзурнай сістэмы прысвечаны манаграфіі Д.Л. Бабічэнка, А.В. Блюма[38]. Значную вартасць маюць працы У.І. Адамушкі, І.М. Кузняцова[39], дзе ўпершыню прааналізавана гісторыя палітычных рэпрэсій у Беларусі; даецца аб'ектыўная ацэнка ў тым ліку і пасляваеннаму перыяду, але без упору на штодзённасць. Найбольш набліжаны да разглядаемай намі тэмы зборнік "Палітычныя рэпрэсіі на Беларусі ў XX стагоддзі", выдадзены на аснове матэрыялаў аднайменнай канферэнцыі[40]. Прэзен-

таваныя даследаванні па гісторыі таталітарнай сістэмы ў Беларусі закранаюць асобныя бакі праблемы - гісторыю лёсаў прадстаўнікоў розных груп насельніцтва, карнай палітыкі ў БССР як даваеннага, так і пасляваеннага перыяду.

Сярод выданняў па карнай палітыцы БССР прыярытэт належыць выдадзеным МУС РБ: храналагічнаму даведніку І.А. Саракавіка, заснаванаму на кароткім аглядзе асноўных дакументаў па МУС Беларусі; даследаванню па гісторыі папраўча-працоўных устаноў А.В. Шаркова, В.Б. Шабанава[41]. Разглядаюцца форма і метады папраўча-працоўнай палітыкі дзяржавы, скіраванасць выкарыстання зняволеных для аднаўлення народнай гаспадаркі БССР, пытанні рэпатрыяцыі і ваеннапалонных.

Рэпрэсіі ў інтэлігенцкім асяроддзі даследаваліся Л. Мараковым, В.К. Ракашэвічам[42]. Выдадзены біяграфічны зборнік, які прысвечаны пацярпелым ад сталінскіх рэпрэсій супрацоўнікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, прадстаўляе н каторую колькасць ахвяр пасляваеннага перыяду[43].

Карная палітыка ў БССР закранала і рэлігійны асяродак, што адлюстравана ў біяграфічным даведніку аб рэпрэсаваных рыма-каталіцкіх святарах[44].

Такім чынам, гістарыяграфія характарызуецца спробамі вырашыць асобныя пытанні, напрыклад, па супраціўленні савецкім уладам, калектывізацыі і інш. Уласна рэпрэсіям 1944-1953 гг. прысвечана ў Беларусі няшмат манаграфій. Маюцца толькі асобныя публікацыі ў зборніках. Гісторыя штодзённасці Беларусі амаль не вывучалася ў адрозненне ад агульнасаюзнай. Па першым пасляваенным дзесяцігоддзі ў БССР комплексных даследаванняў няма (тым больш у кантэксце рэпрэсіўнай палітыкі), але назіраюцца зрухі да вывучэння названай праблематыкі.

[1] Гл.: Вішнеўскі А.Ф. Палітыка-прававы рэжым савецкай дзяржавы (1917-1953 гг.). Мн., 2003.

[2] Гл.: Ильин В.И. Государство и социальная стратификация советского и постсоветского общества, 1917-1996 гг. Опыт конструктивистско-структуралистского анализа. Сыктывкар, 1996; Гл.: Романовский В.Н. Социология позднего сталинизма // Социологические исследования. 1997. № 2. С. 69-75.

[3] Гл.: Зубкова Е.Ю. Послевоенное советское общество: политика и повседневность. 1945-1953. М., 1999.

[4] Гл.: Есаков В.Д., Левина Е.С. Дело КР. Суды чести в идеологии и практике послевоенного сталинизма. М., 2001; Гл.: Пыстина Л.И. Проблемы изучения научной интеллигенции в послевоенные годы (идеологические компании 1940-х гг.) // Интеллигенция в советском обществе. Межвузовский сб. науч. трудов. Кемерово, 1993. С. 162-171.

[5] Гл.: Долгов В.С. Общественное хозяйство колхозов к концу восстановительного периода (По материалам годовых отчетов колхозов за 1949-1950 гг.) // Проблемы истории современной советской деревни. 1946-1973 гг. М., 1975. С. 171-179; Гл.: Чистяков В.Б. Подготовка кадров руководителей колхозного производства в 1946-1950 гг. // Там жа. С. 371-379.

[6] Гл.: Безнин М.А., Димони Т.М. Повинности российских колхозников в 1930-1960-е годы// Отечественная история. 2002. №2. С. 96-111; Гл.: Зима В.Ф. Голод в СССР в 1946-1947 гг.: происхождение и последствия. М., 1996; Гл.: Попов В.П. Крестьянские налоги в 40-е гг. // Социологические исследования. 1997. № 2. С. 95-114.

[7] Гл.: Вербицкая О.М. Российское крестьянство: от Сталина к Хрущёву, середина 40-х - начало 60-х гг. М., 1992.

[8] Гл.: Васильева О.Ю. Русская православная церковь в политике советского государства в 1943-1948 гг. М., 2001; Гл.: Шкаровский М.В. Русская Православная Церковь при Сталине и Хрущеве: (Государственно-церковные отношения в СССР в 1939-1964 годах). М., 2000.

[9] Гл.: Байрау Д. Интеллигенция и власть: советский опыт // Отечественная история. 1994. № 2. С. 122-135; Гл.: Лукин Ю.Ф. Сопротивление тоталитаризму, активность и протест в истории советского общества: Автореф. дис. ... канд. ист. наук. М., 1993.

[10] Гл.: Арзамаскин Ю.Н. Заложники ІІ-й мировой войны. Репатриация советских граждан в 1944-1953 гг. М., 2001.

[11] Гл.: Беда А.М. Советская политическая культура через призму МВД: от «московского патриотизма» к идее «Большого отечества» (1946-1958). М., 2002.

[12] Гл.: Фатеев А.В. Образ врага в советской пропаганде, 1945-1954. М., 1999.

[13] Гл.: Касцюк М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. Мн., 2000.

[14] Гл.: Бушчык Г.П. Выкарыстанне рэпарацый для аднаўлення гаспадаркі Беларусі пасля Другой Сусветнай вайны // XXI век: актуальные проблемы исторической науки: Материалы междунар. науч. конф., посвящ. 70-летию ист. фак. БГУ, Минск, 15-16 апр. 2004 г. Мн„ 2004. С. 237-238; Гл.: Марчанка І.Я. Аднаўленне індустрыі Беларусі ў пасляваенныя гады: вопыт і праблемы // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы). Усебел. канф. гісторыкаў, Мінск, 3-5 лют. 1993: У 2 ч. Ч. 1. Пстория Беларусі. Мн., 1994. О 219-225.

[15] Гл.: Марченко И.Е. Рабочий класс БССР в послевоенные годы (1945-1950). Мн., 1962.

[16] Гл.: Астрога В. Правінцыйная навука (дзейнасць кафедры гісторыі Маладзечанскага настаўніцкага інстытуту ў 1947-1953 гг.) // Беларусь у XX стагоддзі. Мн., 2002. Вып. 1. С. 9-11; Гл.: Корзенко Г.В. Научная интеллигенция Белоруссии в 1944-1990 гг. (подготовка, рост, структура). Мн., 1995.

17 Гл.: Ліндн эр Р. Гісторыкі і ўлада: Нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX - XX ст. СПб.. 2003.

18 Гл.: Белязо А.П. Беларуская вёска ў пасляваенныя гады (1945-1950). Мн., 1974; Гл.: Кота ў А.І. Некаторыя пытанні вырашэння жыллёвай праблемы ў пасляваеннай беларускай вёсцы (1945-1955) // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы). Усебел. канф. гісторыкаў, Мінск, 3-5 лют. 1993: У 2 ч. Ч. 1. Гісторыя Беларусі. Мн., 1994. С. 225-230.

19 Гл.: Навіцкі У.І. Пасляваенная калектывізацыя заходнебеларускай вёскі // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: Гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэт. канф., 17-18 верас. 1999 г. Мн., 2000. С. 267-275; Гл.: Сарокін А.М. На ростанях айчыннай гісторыі. Беларуская вёска: Ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917-1990-я гады). Мн., 1999.

20 Гл.: Верашчагіна А.У., Гурко А.В. Гісторыя канфесій на Беларусі ў другой палове XX ст. Мн., 1999; Гл.: Навіцкі У. І. Партыйна-дзяржаўная палітыка да рэлігіі ў пасляваенны час // Канфесіі на Беларусі (к. XVIII - XX ст.). Мн., 1998. С. 234-263.

21 Гл.: Сямашка Я.І. Армія Крайова на Беларусі. Мн., 1994.

22 Гл.: Ермолович В.И., Жумарь С. Е. Огнем и мечом: Хроника польского националистического подполья в Белоруссии (1939-1953 гг.). Мн., 1994.

23 Гл.: Валаханович И.А. Антисоветское подполье на территории Беларуси в 1944-1953 гг. Мн., 2002; Гл.: Гардзіенка А. Антыкамуністычнае падполле ў Беларусі (1944-1953 гг.) // Гісторыя, якой няма ў падручніках: Матэрыялы навук.-практ. канф., Мінск. 27 крас. 2002 г. Мн., 2002. С. 147-152.

24 Гл.: Ёрш С. Вяртанне БНП. Асобы і дакументы Беларускай Незалежніцкай Партыі. Менск-Слонім, 1998; Гл.: Чарняўскі М. Школьныя падпольныя арганізацыі Віленшчыны ў пасляваенныя гады: спроба "вуснай дакументалістыкі" // Гісторыя Беларусі ў еўрапейскім кантэксце: Матэрыялы гіст. семінараў, якія адбыліся ў Мін. міжнар. адукац. цэнтры ў 2001 г. Мн., 2002. С. 138-147.

25 Гл.: Антысавецкія рухі ў Беларусі: 1944-1956. Даведнік. Мн., 1999.

26 Гл.: Вялікі А.Ф. На раздарожжы. Беларусы і палякі ў час перасялення (1944-1946). Мн., 2005; Гл.: Елизарова Г.В. Переселение белорусского населения из Польши в БССР (1944-1947 г.) // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця: Матэрыялы рэспуб. навук. канф.: У 4 ч. Гродна, 2003. Ч. 3. С. 196-200; Гл.: Сідлярэвіч А. Фармаванне сучаснае беларуска-польскае мяжы ў дакумэнтах і вусных успамінах (1944-1950) // Спадчына. 2002. № 2-3. С. 35-55.

27 Гл.: Кіпель В. Беларусы ў ЗША. Мн., 1993.

28 Гл.: Белорусские остарбайтеры: ист.-аналит. исслед. Мн., 2001; Гл.: Гребень Е.А. Организационные мероприятия властей БССР по приему и обустройству граждан, репатриированных из Германии // Актуальныя праблемы. С. 96-100.

29 Гл.: Шарков А. В. Архипелаг ГУПВИ: Военнопленные и интернированные на территории Беларуси: 1944-1951 гг. Мн., 2003.

30 Гл.: Галімава Н.П. Аднаўленне і развіццё школьнай адукацыі на Берасцейшчыне ў першыя пасляваенныя гады // Актуальныя праблемы. С. 89-93; Гл.: Тищенко Е. М. Здравоохранение Белоруссии в первое послевоенное десятилетие (1946-1955 г.) // Там жа. С. 201-207.

31 Гл.: Лісейчыкаў Дз. Другія Саветы (асаблівасці палітычнага жыцця Ляхавіччыны ў 1944-1950 гг.) // Terra historica. 2002. № 1. С. 64-77.

32 Гл.: Кан А.С. Историография, источниковедение, методы исторического исследования. Постсоветские исследования о политических репрессиях в России и СССР // Отечественная история. 2003. № 1. С. 120-133.

33 Гл.: Кудрявцев В.Н., Трусов А. И. Политическая юстиция в СССР. М., 2000.

34 Гл.: Звягинцев А.Г., Орлов Ю.Г. Приговоренные временем: Российские и советские прокуроры, XX век. 1937-1953. М., 2001; Гл.: Соломон П. Советская юстиция при Сталине. М., 1998.

35 Гл.: Земсков В.Н. Заключённые, спецпоселенцы, ссыльнопоселенцы, ссыльные и высланные (статистико-географический аспект) // История СССР. 1991. № 5. С. 151-165; Гл.: Ён жа. Репатриация советских граждан и их дальнейшая судьба (1944-1956 гг.) // Социологические исследования. 1995. № 5. С. 3-13; Гл.: Ён жа. Судьба «кулацкой ссылки» (1930-1954 гг.)// Отечественная история. 1994. № 1. С. 118-143.

36 Лубянка. ВЧК - ОГПУ - НКВД - НКГБ - МГБ - МВД - КГБ, 1917-1960: Справочник. М., 1997.

37 Гл.: Детков М.Г. Содержание карательной политики советского государства и ее реализация при исполнении наказания в виде лишения свободы в тридцатые-пятидесятые годы. Домодедово, 1992; Гл.: Кокурин А., Петров Н. НКВД - НКГБ - СМЕРШ: структура, функции, кадры // Свободная мысль. 1997. № 9. С. 93-101; № 11. С. 109-121; № 12. С. 102-119; 1998. № 1.С. 112-123.

38 Гл.: Бабиченко Д.Л. Писатели и цензоры. Советская литература 1940-х гг. Под политическим контролем ЦК. М., 1994; Гл.: Блюм А.В. Советская цензура в эпоху тотального террора, 1929-1953. СПб., 2000.

39 Гл.: Адамушка У. Палітычныя рэпрэсіі 20-50-ых гадоў на Беларусі. Мн., 1994; Гл.: Кузнецов И. Политические репрессии в Беларуси (1944-1953-е гг.) // Гісторыя, якой няма ў падручніках: Матэрыялы навук.-практ. канф., Мінск, 27 крас. 2002 г. Мн., 2002. С. 11-27.

40 Гл.: Палітычныя рэпрэсіі на Беларусі ў XX стагоддзі: Матэрыялы навук.-практ. канф. (Мінск, 27-28 лютага 1998 г.). Мн., 1998.

41 Гл.: История исправительно-трудовых учреждений Беларуси: Курс лекций. Мн., 1999; Гл.: Саракавік І. А. Псторыя органаў унутраных спраў Беларуси храналагічны даведнік. Мн., 2003.

42 Гл.: Маракоў Л. Вынішчэнне: Рэпрэсаваныя беларускія літаратары: Даведнік. Мн., 2000; Гл.: Ракашевич В.К. Главлит БССР (1923-1991) // Беларускі археаграфічны штогоднік. Мн., 2000. Вып. 1.С. 178-189.

43 Гл.: Возвращенные имена: Сотрудники АН Беларуси, пострадавшие в период сталинских репрессий. Мн., 1992.

44 Гл.: Няхай сьведчаньне іх веры не забудзецца. Лес каталіцкага касьцёла на Беларусі. 1917-1953 гг. Гродна, 2000.

Паступіў у рэдакцыю 18.05.05.

***Ірына Сяргееўна Кашталян*** - аспірантка кафедры гісторыі Расіі. Навуковы кіраўнік - доктар гістарычных навук, прафесар В.І. Менькоўскі.